№7 Красавік 2007

Свабодны Салігорск

незалежная газэта Салігорска

Выдаецца з верасьня 2006 г. пры інфармацыйнай падтрымцы Маладога Фронта і сайта САЛІГОРСК.org (www.saligorsk.org)

ХРОНІКА РЭПРЭСІЙ У САЛІГОРСКУ З НАГОДЫ СЬВЯТКАВАНЬНЯ ДНЯ ВОЛІ

Прапануем вашай увазе хроніку рэпрэсіяў у Салігорску 22-27 сакавіка. 22 сакавіка 2007 г. Дырэктары Салігорскіх школаў сумесна з намесьнікамі і сацыяльнымі пэдагогамі пачалі абход бацькоў сябраў МФ школьнага ўзросту. Так, прыкладам, яны завіталі да бацькоў Анатоля Мірашнічэнкі, Андруся Тычыны, Таранік Аліны, братоў Шылаў. Бацкоў запалохвалі дыкрэтам прэзідэнта №18, які прадугледжвае прымусовае адабраньне дзяцей у бацькоў, якія вядуць амаральны лад жыцьця. Таксама прымушалі бацькоў падпісаць ліст, у якім сьцьвярджалася аб адказнасьці бацькоў за ўдзел дзяцей у масавых акцыях 25 сакавіка. Супрацоўнікі школ вусна патрабавалі, каб бацькі ўсталявалі татальны кантроль за сваімі дзецьмі й не пускалі іх на вуліцу ў пэрыяд з 24-га па 25-га сакавіка ўлучна і папярэджвалі, што калі яны гэтага ня зробяць, то дзеці ўсё роўна будуць затрыманыя супрацоўнікамі міліцыі, якія будуць стала дзяжурыць ля пад'ездаў. Апошняе, як паказалі далейшыя падзеі, не было блефам. **Старонка 2**

БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА



Палітычнай базай для дзяржаўнага адраджэньня стаў Усебеларускі Зьезд 1917 г. Сярод шэрагу падобных асамблеяў, што прагрымелі па ўсіх нацыянальных ускраінах былой Расейскай імпэрыі, Зьезд быў небывала прадстаўнічым: 5 сьнежня 1917 г. у будынку, дзе сёньня разьмяшчаецца Тэатар Янкі Купалы, з усёй краіны сабралася 1872 чалавекі – 1176 з правам вырашальнага голасу і 706 – з дарадчым, у асноўным беларускія сяляне й вайскоўцы. 17 сьнежня Зьезд разагналі бальшавікі. Але ён пасьпеў стварыць беларускі парлямэнт – Раду БНР, і беларускі Урад – Народны Сакратарыят. БНР стала адзінай легітымнай беларускай уладай таго часу.

Праект "БНР" раскруціла каманда інтэлектуалаў, якія мелі бліскучую адукацыю, валодалі замежнымі мовамі і зрабіліся першаклясными палітыкамі, эканамістамі й дыпляматамі. БНР абвесьціла дзяржаўную незалежнасьць, без выкупу перадала зямлю тым, хто на ёй працуе, нацыяналізавала нетры, лясы й багацьці, дэкляравала правы, свабоды, недатыкальнасьць асобы й 8-гадзінны працоўны дзень. **Старонка 4**

Власть предлагает компромисс

Вместо автокранов и тракторов к Солигорскому рынку на переговоры подъехало несколько дорогих иномарок с местными вертикальщиками. На рынке "Старовокзальный" 26 марта был выходной. Однако подавляющее большинство предпринимателей к 9 утра собрались на своих рабочих местах. Чтобы охранять контейнер, которые ЖКХ обязан был вывезти на рынок, что открывается на окраине города.

Старонка 3

Как лепят правонарушителей

В Солигорке прошли административные суды над задержанными накануне Дня Воли Двадцатитрехлетний Денис Корнов прошел через два судебных разбирательства. Сорокачетырехлетний Владимир Шило вынужден будет заплатить 22 базовые величины. Решение по тому и другому правонарушителю выносил судья Буравцов. . **Старонка 5**

Шахцёры выйдуць пратэставаць. Але – паасобку

Салігорскія шахцёры цягам году вядуць перамовы з прадстаўнікамі Міністэрства працы, Адміністрацыі прэзыдэнта, Фэдэрацыі прафсаюзаў Беларусі з патрабаваньнем выключыць з праекту Закону "Аб прафэсійным пэнсійным страхаваньні" норму, згодна з якой працаўнік ня зможа атрымаць датэрміновую пэнсію, калі будзе працягваць працаваць у шкодных умовах. Збор подпісаў, ліставаньне, перамовы пакуль не даюць вынікаў. Таму цяпер шахцёры наважаныя на масавыя акцыі пратэсту.

І праўладная пярвічка "Белхімпрафсаюзу", і Незалежны прафсаюз гарнякоў, што ўваходзіць у Беларускі кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў – адстойваюць інтарэсы працоўных. Але акцыі пратэсту з аднымі і тымі ж патрабаваньнямі яны ладзяць паасобку. **Старонка 3**

Больш за 900 фотаздымкаў з Салігорску. На нашае галерэі ад сёньня вы маеце мажлівасьць прагледзець каля тысячы фотаздымкаў гораду шахцёраў, моладзёвых акцыяў й імпрэзаў, судоў над лідэрамі "Маладога Фронту". **Старонка 3**

ЦІ БУДУЦЬ ПРЫПЫНКІ АГУЧВАЦЦА ПА БЕЛАРУСКУ ?

Актывісты Салігорскай філіі Маладога Фронту атрымалі адказ з райвыканкаму па моўным пытаньні. Нагадаем, што два месяцы таму моладзь Салігорска зьбірала подпісы пад зваротам да старшыні Салігорскага раённага выканаўчага камітэта А. Б. Рымашэўскага з заклікам правесьці шэраг культурных мерапрыемстваў для папулярызацыі беларускай мовы. Аднымі з асноўных патрабаваньняў былі агучваньне прыпынкаў у грамадзкім транспарце па беларуску й правядзеньне ток-шоў на СТК па моўным пытаньні. За некалькі тыдняў маладзёны сабаралі 1796 подпісаў. Сярод падпісантаў быў нават былы кандыдат на прэзыдэнта Аляксандар Мілінкевіч. **Старонка 3**

ХРОНІКА РЭПРЭСІЙ У САЛІГОРСКУ З НАГОДЫ СЬВЯТКАВАНЬНЯ ДНЯ ВОЛІ

(Працяг , пачатак на старонке 1)

Сярод такіх "сумленных" супрацоўнікаў школаў асабліва вызначыліся выконваючая абавязкі дырэктара СШ №4 Семчанкова Алена Мікалаеўна, сацыяльны пэдагог СШ №4 Сыцько Ірына Аляксандраўна, дырэктар СШ №3 Самойлаў Анатоль Мікалаевіч. Дырэктар ПТВ-72 Піскуноў Юры Міхайлавіч правёў "інструктаж" бацькоў моладзевага актывіста Яўгена Мядзьведзева. Акрамя таго ў школах адбыліся, так званыя, прафіляктычныя гутаркі з маладзёнамі з мэтай іх запужваньня напярэдадні Дня Волі.

23 сакавіка 2007 г.

Зранку супрацоўнікамі салігорскае міліцыі быў затрыманы сябра Маладога Фронту Карноў Дзяніс. Старшы інспэктар Салігорскага РАУС капітан міліцыі Дрэнь Д. В. сумесна са старшым інспэктарам Бярковічам А. Е. незаконна прасякнулі ў адчыненую кватэру Карнова і наўпрост з ложку даставілі ў пастарунак. У пастарунку інспэктарам Дрэнь Д. В. быў складзены пратакол аб затрыманьні Карнова за нібыта брудную лаянку на вуліцы, сьведкам чаго стаў інспэктар Бярковіч А. Е. Праз некаторы час Карноў быў дастаўлены ў Суд, дзе яму быў прызначаны штраф у памеры 62 тысячаў рублёў. Для міліцыянтаў такі прысуд быў нечаканасьцю. Таму, параіўшыся з начальнікам Салігорскае міліцыі Захарчуком У. А., міліцыянты цынічна паведамілі Карнову, што ён ізноўку лаяўся мацюкамі і зьмясьцілі ў ізалятар часовага ўтрыманьня.

У гэты ж дзень супрацоўнікі ДАІ адабралі ў мясцовага лідэра прадпрымальнікаў Аляксандра Цэцуры асабісты аўтамабіль. Падставай для адабраньня стала пабітая фара аўтамабіля. Інспэктар ДПС старшы лейтэнант Амяльчэня Н. О. заявіў, што некалі раней у Салігорску на дарозе быў зьбіты чалавек, а кіроўца скрыўся. І нібыта гэта і ёсьць той аўтамабіль.

Таксама ў гэты дзень супрацоўнікі ДАІ наведалі Андрэя Батуева, брата вядомага салігорскага актывіста Паўла Батуева. Андрэй зь сябрамі плянаваў на асабістым мікрааўтобусе наведаць Менск 25 сакавіка. Даішнікі папярэдзілі, што калі ён гэта зробіць, то застанецца без правоў кіроўцы.

Акрамя таго, у гэты дзень два супрацоўніка міліцыі ў цывільным старанна шукалі Івана Шылу ў СШ №4.

Міліцыянты наведвалі кватэру сябра КХП БНФ Алега Борына і кватэру сябра ПБНФ Паўла Батуева. Пасьля візыту міліцыянтаў дырэктарка крамы, дзе працуе Зьміцер Карноў, заявіла, што зволіць хлопца, калі той паедзе ў Менск 25 сакавіка.

Так сама 23 сакавіка моладзевага актывіста Валабуева Аляксея супрацоўнікі ў цывільным пільнавалі пасьля працы. Хлопцу пашчасьціла пакінуць месца працы незаўважаным і зьехаць з гораду. Каб знайсьці Валабуева міліцыянты зьвярнуліся за дапамогай калегаў Аляксея, тэлефанавалі яго дырэктару. Увечары яны нахабна, у колькасьці каля 10-ці чалавек, уварваліся да сяброў Аляксея, у якіх ён месьціца. Міліцыянты запатрабавалі, каб тыя патэлефанавалі Валабуеву. Па тэлефоне адзін зь міліцыянтаў хлусьліва прадставіўся загадкавым Аляксандрам Яфімчыкам, сказаў што тэлефануе па працы, прапанаваў сустрэцца і, зразумела, атрымаў адмову. Да таго ж, міліцыянты цалкам незаконна спрабавалі правесьці агляд асабістых рэчаў у кватэры і пагражалі пастарункам тым, хто ў ёй знаходзіўся.

Увечары 23 сакавіка супрацоўнік УІМ Салігорскага РАЎС Какоткі і супрацоўнік ІДН Салігорскага РАУС Сторажаў пачалі перасьледваць Уладзіміра Шылу, ад якіх ён быў вымушаны схавацца ў...краме, дзе міліцыянты баяліся ўчыняць вэрхал. Даведаўшыся пра перасьлед бацькі ў краму тэрмінова прыбег ягоны сын Ільля. Тым часам міліцыянты выклікалі на дапамогу супрацоўнікаў ППСМ Палякова і Стэцко. Калі Шылы пыталіся пакінуць краму міліцыянты пачалі гвалтоўна затрымліваць бацьку з сынам, зьбіваць. Пры гэтым былі ўжыты спэцсродкі, то бок наручнікі і дубінкі ПР-73. Трэба адзначыць, што гэтыя спэцсродкі былі ўжытыя і ў дачыненьні да непаўнагадовага Ільлі. Дадзеныя факты былі адзначаныя ў пратаколах затрыманьня. Трэба адзначыць, што пратакол затрыманьня быў складзены ў пастарунку супрацоўнікам УІМ Салігорскага РАУС лейтынантам міліцыі Бойка В. Н., які ўвогуле адсутнічаў пры затрыманьні. Больш таго, інструктаж па складаньню пратаколу вёў маёр міліцыі Лімонаў, нефармальна адказны за працу з апазыцыйнымі коламі. Пасьля складаньня пратаколу Ўладзімір Шыла быў зьмешчаны ў ІЧУ, а яго сын Ільля вызвалены праз тры гадзіны.

24 сакавіка 2007 г.

Супрацоўнікі Салігорскага ДАІ кантралююць выезд з гораду.

За кватэрай Шылаў устаноўлена кругласуткавае назіраньне. Тэлефануюць невядомыя, шукаюць Ільлю Шылу. Міліцыянты працягваюць пошук Аляксея Валабуева. Пакінулі свае тэлефоны (774-94-83; 391-04-34) ў надзеі, што хто небудзь стукане ў выпадку зьяўленьня хлопца.

25 сакавіка 2007 г.

Зранку супрацоўнікі школаў зноўку абыходзілі кватэры моладзевых актывістаў. Тэлефанавалі бацькам непаўнагадовых Рыгора Астапені і Хрысьціны Самойлавай. На трасе Салігорск - Менск усталяваны татальны кантроль ДАІ. Практычна кожны мікрааўтобус даглядаецца. Салігорскае ДАІ кантралюе выезды з горада. У даішнікаў ёсьць фотаздымкі з прозьвішчамі і кароткімі дадзенымі актывістаў салігоршчыны, якіх не ў якім выпадку нельга выпусьціць з гораду, ёсьць дадзеныя па асабістым транспарце актывістаў.

Пасьля заканчэньня мітынгу ў Менску сьціхаюць рэпрэссіі і ў Салігорску. А 15-й гадзіне, даволі нечакана, пад падпіску вызваляюць да суду Карнова Дзяніса. Суд павінен адбыцца 27 сакавіка а дзясятай гадзіне раніцы. А 21-й вызваляюць да суду Ўладзіміра Шылу. Суд павінен адбыцца а дзясятай гадзіне раніцы 27 сакавіка.

Затрыманага ў Менску Паўла Батуева дастаўляюць у Салігорск мясцовыя міліцыянты. Жудасным падаецца той факт, што гэтыя міліцыянты былі адмыслова накіраваныя ў Менск, каб адсочваць паводзіны Салігорскіх актывістаў. Пры гэтым яны знаходзіліся сярод астатніх дэманстрантаў і ім нават былі выдадзеныя банданы з эмблемай Эўразьвязу. Даставіўшы Батуева да дому яму было загадана зьявіцца на наступны дзень да начальніка салігорскае міліцыі Захарука У. А. на размову.

26 сакавіка 2007 г.

Адбылася прафіляктычная размова Паўла Батуева з начальнікам салігорскае міліцыі Захарчуком У. А. Гэтак сама гутраку з начальнікам міліцыі меў й лідар прадпрымальнікаў Аляксандр Цацура.

Да прадпрымальніка і дэмакратычнага актывіста Ўладзіміра Шылы "выпадкова" завіталі прадстаўнікі Адзьдзелу па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі з дбайнай праверкай.

27 сакавіка.

Суд пакараў Дзяніса Карнова 2 базавымі велічынямі штрафу за "дробнае хуліганства"(62 тыс.) Уладзімір Шыла атрымаў 682 тыс. рублёў штрафу "за супраціў міліцыянтам й брудную лаянку".

Шахцёры выйдуць пратэставаць. Але – паасобку

(Працяг , пачатак на старонке 1)У пачатку красавіка пачынаецца веснавая сэсія Палаты прадстаўнікоў, на якую выносіцца законапраект “Аб прафэсійным пэнсійным страхаваньні”. Таму шахцёры сьпяшаюцца. Прафсаюз хімікаў падаў заяўку ў Менскі аблвыканкам на імя Дамашкевіча і на імя старшыні Салігорскага райвыканкаму Рымашэўскага аб правядзеньні 10 красавіка мітынгу-пратэсту пад лёзунгам “Рукі прэч ад ільготных пэнсіяў!” “Адначасова зьвярнуліся да прэзыдэнта ўжо ў другі раз, у Савет Міністраў да Сідорскага, каб яны прынялі ўсе залежныя ад іх захады па недапушчэньні дэстабілізацыі, таму што працаўнікі хвалююцца, патрабуюць ад прафсаюзу канкрэтных захадаў па абароне сваіх інтарэсаў”, – гаворыць намесьнік старшыні прафсаюзу хімікаў Сьцяпан Івашкевіч. Прафсаюз хімікаў спадзяецца вывесьці на мітынг 5-6 тысяч чалавек. “Усе на мітынг! Пакажам дзяржаўным служачым сваю рашучасьць і салідарнасьць, прымусім іх паважаць інтарэсы народу!”, – гаворыцца ў звароце аргкамітэту прафкаму. Вось толькі Фэдэрацыя прафсаюзаў Беларусі не падтрымала страйкоўцаў. Незалежны прафсаюз гарнякоў таксама выступае ў абарону пэнсіяў шахцёраў. У сакавіку ён падаваў заяўку на правядзеньне пікету 14 сакавіка, але тады пікетаваньне мясцовыя ўлады не дазволілі: спаслаліся на эпідэмію грыпу, маўляў, масавыя мерапрыемствы забароненыя. І вось зараз Незалежны прафсаюз гарнякоў зноў актывізаваўся. “Мы падалі заяўку на 13 красавіка на шэсьце і мітынг на плошчы Цэнтральнай, але, думаем, будзе “стопудовая” забарона. І таму падалі яшчэ адну заяўку на пікет, таксама на 10 красавіка,ад 10-й раніцы да 17-й. Пікет на стадыёне “Будаўнік”, дзе і “хімікі”, – распавёў Дзяніс Таўпека. Намесьнік старшыні Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў, у склад якога ўваходзіць незалежны прафсаюз гарнякоў Мікалай Канах выказаў такое меркаваньне: “Паміж імі ад самага пачатку стварэньня нашага прафсаюзу ёсьць пэўны антаганізм. Робяць яны адну справу, але дух суперніцтва застаўся. Ёсьць паняцьце “дух спаборнасьці”, але калі пытаньне тычыцца інтарэсаў працоўных, тут трэба выступаць разам”. **Іна Студзінская, Менск**

Власть предлагает компромисс

Вместо автокранов и тракторов к Солигорскому рынку на переговоры подъехало несколько дорогих иномарок с местными вертикальщиками. На рынке "Старовокзальный" 26 марта был выходной. Однако подавляющее большинство предпринимателей к 9 утра собрались на своих рабочих местах. Чтобы охранять контейнер, которые ЖКХ обязан был вывезти на рынок, что открывается на окраине города. Больше всего предпринимателей возмутило то, что власть санкционировала такую акцию уже 26 марта, несмотря на оплаченную аренду мест до 1 апреля. Очевидно, с учетом всех этих обстоятельств и, главное, чтобы похоронить идею местного референдума, сверху было дано "добро" на некоторые уступки. Чиновники заявили: государственный рынок решено оставить, но оборудован он будет в другом месте. Здесь же однозначно появится дворец. Председатель райисполкома Александр Римашевский предложил на выбор две площадки. Не в центре, но расположение получше, чем у переоборудованной под частный рынок автостоянки. Пока же, на короткое время – неделя-две – ИП остаются на "Старовокзальном". Пока предприниматели в раздумье. Некоторые настаивают, что надо добиваться территории, отданной несколько лет назад одной минской фирме под строительство крытого рынка. Недавно землю перекупил российский собственник. Но на стройке по-прежнему тишина. Другие согласны на одну из площадок. Третьи по-прежнему говорят о необходимости референдума. **Лариса Насанович**

ЦІ БУДУЦЬ ПРЫПЫНКІ АГУЧВАЦЦА ПА БЕЛАРУСКУ

Актывісты Салігорскай філіі Маладога Фронту атрымалі адказ з райвыканкаму па моўным пытаньні. Нагадаем, што два месяцы таму моладзь Салігорска зьбірала подпісы пад зваротам да старшыні Салігорскага раённага выканаўчага камітэта А. Б. Рымашэўскага з заклікам правесьці шэраг культурных мерапрыемстваў для папулярызацыі беларускай мовы. Аднымі з асноўных патрабаваньняў былі агучваньне прыпынкаў у грамадзкім транспарце па беларуску й правядзеньне ток-шоў на СТК па моўным пытаньні. За некалькі тыдняў маладзёны сабаралі 1796 подпісаў. Сярод падпісантаў быў нават былы кандыдат на прэзыдэнта Аляксандар Мілінкевіч. У адказе старшыні выканкама паведамляецца, што кіраўніцтву Аўтапарка №1 рэкамэндавана агучваць прыпынкі на двух дзяржаўных мовах. У прапанаваным ток-шоў на СТК было адмоўлена з-за адсутнасьці студыі. Наконт літаратурных мерапрыемстваў у школах і артыкулах пра гісторыю случыны ў мясцовай прэсе было адзначана, што гэткія мерапрыемствы заплянаваныя і дадзеныя прапановы будуць улічаны. Моладзевы лідэр Іван Шыла, які зьяўляўся каардынатарам кампаніі, так пракамэнтаваў дадзены адказ:

- Пасьля нашае сустрэчы з Аляксандрам Рымашэўскім мы былі настроены даволі скэптычна. У адказ на нашыя прапановы па папулярызацыі роднае беларускае мовы, па правядзеньні літаратурных конкурсаў, нам на жорсткай трасянцы было рэкамэндавана лепш паехаць у калгас і заняцца пытаньнем павелічэньня надояў у кароў. Аднак у пісьме быў дадзены больш менш адэкватны адказ. Нажаль адказ атрымаўся даволі абстрактны. Не зразумела калі і якія мерапрыемствы заплянаваныя ў сувязі з 125-годзьдзем нараджэньня Купалы й Коласа. З гэтае прычыны не магчыма як небудзь на іх паўплываць. Па пытаньні агучваньня прыпынкаў па беларуску выканкамам было рэкамэндавана кіраўніцтву выкарыстоўваць і беларускую і расейскую мову. Але ж, як вядома, рэкамэндацыі не зьяўляюцца абавязковымі і няма аніякай гарантыі, што мы пачуем родную мову ў грамадзкім траспарце. Як паведаміў моладзевы актывіст Аляксей Валабуеў, зыходзячы з атрыманага адказу з выканкаму бліжэйшым часам будуць накіраваныя лісты ў Аўтобусны парк №1 з патрабаваньнем агучваньня прыпынкаў па беларуску, а так сама ў адзьдзелы адукацыі, культуры і ідэалягічнае працы з мэтай высьвятленьня заплянаваных мерапрыемстваў з нагоды 125-годзьдзя Янкі Купалы і Якуба Коласа. Акрамя таго правяраюцца тэхнічныя магчымасьці СТК і наяўнасьць студыі для мажлівага правядзеньня ток-шоў.

Прэс-служба Салігорскага МФ

Больш за 500 фотаздымкаў з Салігорску

На нашае галерэі ад сёньня вы маеце мажлівасьць прагледзець больш за паўтысячы фотаздымкаў гораду шахцёраў, моладзёвых акцыяў й імпрэзаў, судоў над лідэрамі "Маладога Фронту". Фотаздымкі працягваюць дадавацца.Дык карыстайцеся! http://fota.saligorsk.org

Прэс-служба Салігорскага МФ

БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА

Менавіта БНР адчыніла ў ваенным міжчасьсі 200 беларускіх школаў, пераняла ў немцаў гандаль, прамысловасьць і сацыяльную сфэру, дамаглася ўвядзеньня дзьвюхмоўных пашпартоў і пачала фармаваньне беларускага войска. За 9 месяцаў ва ўмовах нямецкае акупацыі БНР пасьпела толькі пачаць поўнамаштабовае дзяржаўнае будаўніцтва – а яе ўжо прызналі 11 дзяржаваў сьвету: Турэччына, Аўстрыя, Польшча, Чэхаславаччына, Фінляндыя, Латвія, Літва, Эстонія, Украіна, Арменія, Грузія. Больш таго – факт малавядомы, але знакавы! – БНР дабраславіў Патрыярх Маскоўскі й Усяе Русі Ціхан.

Але ж ані немцы, ані бальшавікі з БНР папросту не лічыліся. Напрыканцы 1919 г Рада БНР мусіла выехаць у эміграцыю. Лідэры БНР, людзі веруючыя й патрыёты, узначалілі беларускую дыяспару на Захадзе, і перахоўвалі непарыўнасьць хрусталёвае ніці незалежнасьці аж да краху СССР. БНР стала ўвасабленьнем нацыянальнай волі й завочнай апазыцыяй для савецкага рэжыму. Нездарма камуністы БССР ўсё XX ст намагаліся дамовіцца з Радай аб перадачы ім паўнамоцтваў.

Рада БНР дагэтуль – найвялікшы аўтарытэт для беларускага нацыянальнага руху. Лёгкая, прывідная, паветраная, быццам дух, БНР аказалася надзвычай моцным гістарычным аргумантам. Менавіта БНР сьцьвердзіла імя "Беларусь", Менск як сталіцу, "Пагоню" й бел-чырвона-белы сьцяг як нацыянальную сымболіку, і сама зрабілася сьветлым сьцягам Адраджэньня. Менавіта БНР вымусіла бальшавікоў пайсьці на стварэньне БССР, дала зарад 10-гадовай беларусізацыі й, у рэшце рэшт, сфармулявала вобраз цяперашняй Рэспублікі Беларусь.

У параўнаньні зь 70-гадовай і 10-мільённай БССР летуценная й бясплотная Беларуская Народная Рэспубліка адыграла ў беларускай гісторыі значна большую ролю. Настолькі большую, што 25 сакавіка, дата пачатку рэальнае вясны ў Беларусі – з таяньнем сьнегу, імклівым пацяпленьнем і крыгаломам – дагэтуль зьбірае шматтысячныя шэсьці нацыянальнага руху як галоўны беларускі Дзень Незалежнасьці.

Дзень Дабравесьця, у які Марыя пачула, што ў яе народзіцца Ісус. Той дзень у календары, які пачынае пераважаць ноч. Дзень Уваскрасеньня. Дзень Волі. Дзень БНР.

Павал Севярынец

16 красавіка на цэнтральным пляцы ў 20:00 пройдзе чарговая акцыя Салідарнасьці.Прадстаўнікі грамадзкасьці, жонкі скрадзеных палітыкаў, дзеячы навукі й культуры пастанавілі праводзіць акцыі па ўсёй Беларусі і за яе межамі, покуль ўлады не распачнуць расьледваньне і не знойдуць злачынцаў.

Нагадаем, у Беларусі зьніклі вядомыя асобы, у тым ліку Юры Захаранка, Дзьмітры Завадзкі,Віктар Ганчар.

Падазрэньні падаюць на беларускія ўлады.Таму, заклікаем 16 красавіка ў 20:00 прыходзіць на плошчу ці запаліць сьвечку Салідарнасьці дома.

Заўвага. Шмат хто, чытаючы нашае выданьне зьвяртае ўвагу на вялікую колькасьць мяккіх знакаў ды й іншыя акалічнасьці правапісу.

Варта нагадаць, што сёньня ў Беларусі існуюць два правапісы-наркамаўка(што вывучаецца ў школе і зрусіфікавана, штучна набліжана да расейкае мовы) і клясічны правапіс,якія выдадзена газэты і які больш адпавядае нашаму вымаўленьню. Дарэчы, клясічным правапісам карыстаўся Васіль Быкаў, выдавалася й выдаецца першая беларуская газэта "Наша Ніва", піша нацыянальная інтэлігенцыя - Барадулін, Марачкін.

Как лепят правонарушителей

Двадцатитрехлетний Денис Корнов прошел через два судебных разбирательства. Сорокачетырехлетний Владимир Шило вынужден будет заплатить 22 базовые величины. Решение по тому и другому правонарушителю выносил судья Буравцов. Первый раз Дениса взяли утром 23 марта, прямо с постели. Завезли в РОВД, составили протокол, что вечером якобы матерился у подъезда. В тот же день состоялся суд – присудили две минималки. – Я обрадовался, – рассказывает Денис, –что попаду все-таки на День Воли. Но милиция шла от здания суда следом.

В общем, его снова отвезли в РОВД и вторично приписали мелкое хулиганство: выйдя из здания суда, якобы стал громко нецензурно браниться.

За предпринимателем Владимиром Шило вечером 23-го погнались двое в штатском. Шило успел заскочить в продовольственный магазин, позвонил по мобильному семье.

В общем, Солигорский суд наказал Владимира Шило 22 минималками, 20 из которых приходится за сопротивление напавшим на него людям в штатском, оказавшимися сотрудниками угро. У еще одного солигорского демократа Александра Цецура изъяли машину накануне Дня Воли. Якобы для проверки – а не совершила ли наезд? Лидера местной организации КХП Олега Борина несколько дней караулили у подъезда. Стояла машина и люди в ней не скрывались. Звонили Борину и нагло заявляли: "Выходи – отвезем в камеру". Ходят слухи, что местный начальник милиции пообещал в короткое время выкорчевать в Солигорске инакомыслие. Ну что ж, человек, как известно, предполагает, располагает некто Другой.

Лариса Носанович

Дык падпішыся! Калі вы жадаеце рэгулярна атрымліваць газэту паведаміце свой адрас па тэлефонах : **8 (029) 370-02-05** , **8 (029) 255-75-77** ці па e-mail **gazeta@saligorsk.org**

Свабодны Салігорск №5 Люты 2007 г.
незалежная газэта Салігорска

Незалежная салігорская газэта . Выдаецца з верасьня 2006 г. Кантакты:
8(029)370-02-04 8(029)379-28-99 http://gazeta.saligorsk.org salihorsk@gmail.com
Адказнасьць за змешчаны матэр'ял нясуць аўтары.
Надрукавана на асабістам абсталяваньні ІП Сытько І.А
наклад 299 ас. , надрукавана: Балівія, г. Банегас вул.Жылінскага 666/1